h) Комб[айн] як продукт бел[арускай] гіст[орыі]. (У чым асабл[івасьць] бел[арускай] гіст[орыі]? Асабл[івасьць] яе ў тым, што яна зьяўл[яецца] об’ектам змаг[аньня] між Зах[адам] і Усх[одам], што яна жыве на крыжав[ых] дарог[ах].)

i) Комб[айн] як твор гістарычн[ага], грамадзкага і індывід[уальнага] сьвяд[омаснага].

## № 61. [Уладзімеру Дубоўку]

*[Лістапад 1931]*

Д[арагі] Ў[ладзік]!

Перажываньне ссылкі ёсьць перажыв[аньне] быцьця выгнанай Беларусі, быцьця на чужыне ў форме пэўнага грамадзкага ўстанаўленьня. Ужо тое, што нам плацяць пэнсію як ссыльнаму, гаворыць пра тое, што ссыльны — гэта такая–ж дзяржаўная ўстанова, як і нарком які; гэта пэўная дзяржаўная функцыя. Дзяржава такжа ня можа абыйсьціся бяз ссыльн[ага], як і без наркома. Гэта як неабходнасьць. Бяз ссыльнага і дзяржава не дзяржава. Для чаго–ж патрэбен дзяржаве ссыльны? Для таго, каб мець жывую перасьцярогу для мас — жывы помнік недазволенага дзяржаваю, жывы **ўзор нябыцьця** для мас. Вось, маўляў, вам жывы ўзор таго **быцьця** і нябыцьця, да якога прыводзіць непаслухмянства дзяржаве і дзяржаўным людзям. Ссыльны — гэта што жывы плякат для мас з напісам „ня будзьце гэткімі, і вы ўнасьледуеце царства божае на зямлі“. І выраз „гэта ссыльны“ азначае — лёзунг: „Ня будзьце гэткімі, будзьце паслушнымі“.

З другога боку, гэта адна з форм установы дзяржаўнага нявольніцтва і бяспраўнасьці. У гэтым, бадай, і ўсё значэньне ссыльнага для няссыльных, але гэтым ня вычэрпваецца ўвесь чалавек, які прабывае ў гэтым быцьці.

Калі з чалавека, які прабывае ў гэтым быцьці, адняць яшчэ быцьцё, якое азначаецца патрэбамі матар’яльнага жыцьця[2], то яшчэ ў чалавека астанецца яго для самога сябе або таго, што Кал[юга] азначыў вобразам „вольнага ад працы чалавека“ / ці Дуб[оўкаў] „Дзеньдзівір“. Калі азначыць гэтыя дзьве стораны вобразамі двух асобных чалавек, дык перажываньне выгнаньня азначыцца як змаганьне між **Дон Пузам і Дзеньдзівірам** у быцьці ссыльнага, у быцьці выгнанай Беларусі, у быцьці паднявольнай і бяспраўнай Беларусі / расійск[ай] грамады, прыняволенай быць жывою мяжою ідэальнага ў быцьці мас.

(Ліставаньне з сябрамі ў гэтым становішчы — гэта зьяўленьне перамогі Дня над Дном (Дзень — Дно, Адзін — Адно) у сябе, так–бы сказаць, Дом.)

І вось калі я атрым[аў] ад цябе лісты з верша[мі], бы яны ўспрым[аюцца] як праявы гэтакіх перамог у цябе. Скупасьць–жа на [керасін] кажа пра цяжкась[ці] у змаганьні і трудн[асьці] у перамаг[аньні] Дона.

---

За час пражываньня ў Слабадзкім перажылося ўжо некалькі момантаў гэтага змаганьня на самі[м] сабе.

---

[2] або тым, што знайшло сваё выражэньне ў вобразе Дон Пуза.